*Волкава В. В.*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск

*Volkava V.*
National Institute of Higher Education, Minsk

**УДК [94(476)+338.22(=112.2)(476)(091)]«1915/1918»**

# ВАЕННАЕ ЛЯСНОЕ ЎПРАЎЛЕННЕ БЕЛАВЕЖА: СТРУКТУРА АДМІНІСТРАЦЫІ

# BIALOWIEZA MILITARY FORESTRY ADMINISTRATION: STRUCTURE OF THE ADMINISTRATION

*У артыкуле аўтар даследуе органы ўлады і прынцыпы кіравання ляснoй гаспадаркай нямецкімі акупацыйнымі ўладамі ў гады Першай сусветнай вайны на прыкладзе Ваеннага ляснога ўпраўлення Белавежа (Militärforstverwaltung Bialowies). Разглядаюцца пытанні падпарадкавання ўпраўлення армейскаму кіраўніцтву; структура цэнтральнай адміністрацыі і ваенных лясных інспекцый, якія ўваходзілі ў склад ўпраўлення.*
*Ключавыя словы: Першая сусветная вайна; нямецкая акупацыя; беларускія тэрыторыі; Обер Ост; ваеннае лясное упраўленне Белавежа; адміністрацыя; лясная гаспадарка.*

*The author explores the authority and principles of forest management by the German occupation authorities during the First World War on the example of the Bialowieza military forestry administration (Militärforstverwaltung Bialowies). The article analyzes the issues of subordination of the military forest administration to the army leadership; the structure of the central administration and military forest inspections that were part of the military forestry administration.*
*Keywords: World War I; german occupation; belarusian territories; Ober Ost; Bialowieza mimilitary forestry administration; administration; forestry.*

У перыяд Першай сустветнай вайны пасля спынення актыўных ваенных дзеянняў і ўстанаўлення акупацыйнага рэжыму восенню 1915 г. беларускі лес актыўна вывозіўся за межы рэгіёна. Нямецкія ўлады наладзілі на беларускіх тэрыторыях здабычу, вытворчасць і пераапрацоўку розных відаў лесаматэрыялаў, у тым ліку неапрацаваных бярвенняў і драўніны, сыравіны для цэлюлозных і папяровых фабрык, выраб шпалаў для чыгуначных шляхоў, перакладзін, брусоў, тэлеграфных і будаўнічых слупоў, драўнянoй стружкі. У некаторых мясцовасцях была наладжана здабыча драўніннага вугалю, смалы і яловай кары і іншай ляснoй сыравіны. Лесаматэрыялы сталі неабходнай сыравінай для будаўніцтва ваенных умаца-

ванняў, армейскіх пабудоў і баракаў для работнікаў з ліку мясцовых жыхароў, а таксама ліній сувязі на тэрыторыях, якія былі заняты нямецкімі і аўстра-венгерскімі войскамі. Актыўнае будаўніцтва і рамонт чыгуначных шляхоў, асабліва палявых вузкакалеек, прыводзілі да знішчэння лясоў. На чыгуначным транспарце лес выкарыстоўваўся таксама ў якасці паліва.

Для арганізацыі эксплуатацыі лясоў, якія размяшчаліся ў зоне Обер Ост, была ўтворана адпаведная сістэма кіравання. У адміністрацыйнай структуры Галоўнага ўпраўлення Обер Ост пытаннямі лясной гаспадаркі займаўся аддзел лясніцтва, якому падпарадкоўваліся 5 лясных упраўленняў: Курляндыя, Літва, Гродна, Беласток і Белавежа, апошнія тры з якіх распаўсюджвалі сваю юрысдыкцыю на сучасныя беларускія тэрыторыі. Па нямецкіх падліках, агульная плошча іх лясоў складала 363 479 га, упраўлення Белавежа – 137,8 тыс. га. Самым буйным лясным масівам была Белавежская пушча. Прыкладна 80 % дрэў у пушчы лічыліся дастаткова даспелымі і прыдатнымі для дрэваапрацоўкі [1, s. 17].

Распараджэннем Галоўнакамандуючага на Ўсходзе П. фон Гінденбурга ад 30 верасня 1915 г. для тылавога раёна этапнай інспекцыі 9-й нямецкай арміі было створана лясное ўпраўленне Белавежа (*Forstverwaltung Bialowies*) [2, s. 111]. У афіцыйным выданні Галоўнага ўпраўлення Обер Ост «Спіс складу адміністрацыі Обер Ост» (чэрвень 1916 г.) ужываецца ўжо абазначэнне «ваеннае лясное ўпраўленне Белавежа» (*Militärforstverwaltung Bialowies*) [3, s. 46].

Распараджэннем шэфа штаба Усходняга фронту М. Гофмана «Аб новых назвах упраўленняў» ад 4 сакавіка 1917 г. для лясных упраўленняў Белавежа і Беласток пацверджаны, а для ўпраўлення Гродна ўпершыню ўведзена абазначэнне «ваеннае лясное ўпраўленне» (*Militärforstverwaltung*) замест «лясное ўпраўленне» (*Forstverwaltung*) [4].

Ваеннае лясное ўпраўленне Белавежа тэрытарыяльна знаходзілася ў межах упраўлення (з 4 сакавіка 1917 г. – ваеннага ўпралення) Беласток-Гродна, аднак падпарадкоўвалася непасрэдна вайсковаму армейскаму кіраўніцтву:

30 верасня 1915 – 20 сакавіка 1916 гг. – кіраўніцтву этапнай інспекцыі 9-й арміі [5, s. 22];

20 сакавіка 1916 г. – 17 верасня 1917 г. – кіраўніцтву этапнай інспекцыі 12-й арміі;

17 верасня 1917 г. – 31 жніўня 1918 г. – кіраўніку адміністрацыйных аддзелаў Галоўнага ўпраўлення Обер Ост, галоўнаму кватэрмайстару [6].

Успомнім, што згодна з распараджэннем Галоўнакамандуючага на Усходзе генерал-фельдмаршала прынца Леапольда Баварскага ад 10 каст-

рычніка 1916 г. «Аб аб'яднанні ўпраўленняў Гродна і Беластока» Галоўнае ўпраўленне Гродна (*Hauptverwaltung Grodno*), касавалася 1 лістапада 1916 г., а яго тэрыторыя далучалася да Галоўнага ўпраўлення Беласток (*Hauptverwaltung Bialystok*). Новае ўпраўленне атрымала назву «ўпраўленне Беласток-Гродна» (*Verwaltung Bialystok/Grodno*) [7]. З 4 сакавіка 1917 г. у інструкцыі шэфа генштаба М. Гофмана тэрмін «упраўленне» быў заменены на «ваеннае ўпраўленне» адносна ўсіх упраўленняў зоны Обер Ост, у тым ліку і Беласток-Гродна (*Militärverwaltung Bialystok-Grodno*) [8].

У кампетэнцыю адміністрацый лясных упраўленняў ўваходзілі ўсе пытанні, звязаныя з арганізацыяй на беларускіх акупаваных тэрыторыях здабычы і перапрацоўкі розных відаў лесаматэрыялаў, а таксама па вывазе іх за межы рэгіёна ў Варшаўскае генерал-губернатарства, Усходнюю Прусію, гарады ўнутранай Германіі.

Паводле афіцыйнага выдання Галоўнага ўпраўлення «Спіс складу адміністрацыі Обер Ост» (чэрвень 1916 г.), у структуру ваеннага ляснога ўпраўлення Белавежа ўваходзіла цэнтральная адміністрацыя і 11 ваенных лясных інспекцый [3, s. 46].

Цэнтральная адміністрацыя (*Hauptverwaltung*) знаходзілася ў г. Белавежа (цяпер у Падляскім ваяводстве Рэспублікі Польшча) і складалася з кіраўніцтва і 8 аддзелаў (*Abteilung*).

У склад кіраўніцтва ўваходзілі: шэф ляснога ваеннага ўпраўлення – капітан ландвера доктар Эшэрых (*Escherich*; прызначаны 1 кастрычніка 1915 г.); пастаянны прадстаўнік кіраўніка – капітан ландвера ў запасе Хорнунг (*Hornung*); першы ад'ютант – капітан запасу Блюме (*Blume*); другі ад'ютант – старшы лейтэнант запасу Харрер (*Harrer*) [9].

Кожны аддзел адказваў за адзін з кірункаў дзейнасці ўпраўлення:

аддзел I (аддзел персаналу), кіраўнік – капітан ландвера ў запасе д-р Войт (*Voit*);

аддзел II (гаспадаркі і харчовага забеспячэння), кіраўнік – старшы лейтэнант ландвера ў запасе Шонстэдт (*Schönstedt*);

аддзел III (аснашчэння лясной гаспадаркі і абсталявання), кіраўнік – капітан ландвера ў запасе Лаутэншлягер (*Lautenschlager*);

аддзел IV (аддзел збыту), кіраўнік – капітан ландвера ў запасе Бауэр (*Bauer*);

аддзел V (тэхнічны аддзел), кіраўнік на чэрвень 1916 г. не прызначаны;

аддзел VIa (наземнага і чыгуначнага транспарту), кіраўнік – старшы лейтэнант у запасе Хопэ (*Hoppe*);

аддзел VI b (водных шляхоў), кіраўнік – капітан у запасе Хофіг (*Höfig*);

аддзел VII (санітарны), кіраўнік – палявой лекар д-р Санднер (*Sandner*);

аддзел VIII (аддзел фінансаў і бюджэту), кіраўнік не прызначаны.

У падначаленні цэнтральнай адміністрацыі знаходзіліся 11 лясных інспекцый (*Forstamt, Forstinspektion*), з 4 сакавіка 1917 г. перайменаваны ў ваенныя лясныя інспекцыі (*Militärforstinspektion*) на чале з ляснымі капітанамі (*Forsthauptmann*) [10]:

I. Фронт (з цэнтрам у Дзятлава), лясны капітан – капітан ландвера ў запасе Рокстрох (*Rockstroch*);

II. Ціхаволя-Поўнач (з цэнтрам у Дамброва, суч. Астравецкі раён Гродзенскай вобласці), кіраўнік не прызначаны;

III. Ціхаволя-Поўдзень (з цэнтрам у Ціхаволя, суч. Свіслацкі раён Гродзенскай вобласці), кіраўнік не прызначаны;

IV. Белавежа, капітан ландвера ў запасе Хорнунг (*Hornung*);

V. Падаляны (цяпер раён г. Белавежа, Рэспубліка Польшча), капітан Ландвер фон Акстхальб (*von Axthalb*);

VI. Чарлянка (суч. В. Чарняны Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці), капітан запасу Шаумберг (*Schaumberg*);

VII. Гайнаўка (суч. Падляскае ваяводства Рэспублікі Польшча), старшы лейтэнант запасу Луіс *(Louis*);

VIII. Малая Нараўка (15 км на паўночны захад ад г. Белавежа, Рэспубліка Польшча), капітан Ландвер Парст (*Parst*);

IX. Беласток-Усход, капітан запасу фон Штюнцнер (*Stünzner*);

X. Беласток-Захад, капітан запасу Гёдекемеер *(Goedeckemeyer*);

XI. Нараў (з цэнтрам у Беластоку), лясны капітан – капітан Ландвер Трайхель (*Treichel*) [3, s. 47].

Згодна з новай «Арганізацыйнай структурай аддзелаў адміністрацыі пры штабе Обер Ост» на ліпень 1917 г., у структуры цэнтральнай адміністрацыі ваеннага ляснога ўпраўлення адбыліся змены: колькасць аддзелаў скарацілася з 9 да 7, былі пераразмеркаваны іх функцыі, прызначаны новы персанальны склад кіраўніцтва [11, s. 61]. У выніку змен адміністрацыя упраўлення падзялялася на наступныя аддзелы:

аддзел I (лясны аддзел), кіраўнік – капітан у запасе Мантэль (*Mantel*).

аддзел II (гаспадаркі і харчовага забеспячэння), кіраўнік – ротмістр ландвера ў запасе Шонстэдт (*Schönstedt*).

аддзел III (тэхнічны), кіраўнік – капітан Ландвер Прэсль (*Pressl*);

аддзел IV (хімічнай перапрацоўкі), кіраўнік – капітан у запасе Цайс (*Zeiss*);

аддзел V (палявых чыгуначных шляхоў), кіраўнік – капітан у запасе Зэйлер (*Seiler*);

аддзел VI (санітарны), кіраўнік – палявы лекар д-р Санднер (*Sandner*);

аддзел VII (фінансаў і бюджэту), кіраўнік – капітан запасу Франке (Franke).

У сувязі з утварэннем 1 кастрычніка 1916 г. ваеннага ляснога ўпраўлення Беласток (распараджэнне Галоўнакамандуючага на Усходзе Л. Баварскага ад 28 верасня 1916 г.) і перадачай ваенных лясных іспекцый Беласток-Усход, Беласток-Захад, Нараў і Фронт пад яго кіраўніцтва, у ваенным лясным упраўленні Белавежа колькасць лясных інспекцый скарацілася да сямі.

Адбыліся змены персанальнага складу.

I. Белавежа: капітан ландвера ў запасе д-р Войт (*Voit*).

II. Падаляны: капітан ландвера фон Акстхальб (*von Axthalb*);

III. Гайнаўка: капітан ландвера Бауэр (*Bayer*);

IV. Малая Нараўка: капітан ландвера Парст (*Parst*);

V. Чарлянка: капітан ландвер Лаутэншлягер (*Lautenschlager*);

VI. Ціхаволя-Поўнач: старшы лейтэнант запасу Харрэр (*Harrer*);

VII. Ціхавол-Поўдзень: капітан запасу Хауэр (*Hauer*) [11, s. 62].

Лясныя інспекцыі Белавежа, Падаляны, Гайнаўка, Малая Нараўка знаходзіліся на тэрыторыі сучаснай Польшчы, а Чарлянка, Ціхаволя-Поўнач і Ціхаволя-Поўдзень – у сучаснай Беларусі.

У апошні год нямецкай акупацыі Белавежа ўтварыла новы павет. Згодна з распараджэннямі Галоўнакамандуючага на Усходзе прынца Леапольда Баварскага «Межы тылавых раёнаў і ўпраўленняў» ад 26 сакавіка і 5 чэрвеня 1918 г. ва тэрытарыяльна-адміністрацыйным дзяленні ваеннага ўпраўлення Літва[1] адбыліся змены ў сувязі з утварэннем павета Белавежа [12]. Новы павет быў утвораны з тэрыторый павета Бельск і часткі ранейшай аперацыйнай паласы, якая знаходзіцца на поўдзень ад Белавежы [13, s. 5]. Акрамя гэтага, з 21 чэрвеня 1918 г. павет утварыў новую этапную камендатуру

[1] Згодна з распараджэннем Галоўнакамандуючага на Усходзе генерал-фельдмаршала прынца Л. Баварскага «Аб аб'яднанні ваенных упраўленняў Літва і Беласток-Гродна» ад 27 студзеня 1918 г. гэтыя два ўпраўленні 1 лютага 1918 г. зліваліся ў адно ваеннае ўпраўленне Літва (Militärverwaltung Litauen) з цэнтрам у Вільні. Новаўтвораная тэрытарыяльна-адміністрацыйная адзінка падзялялася на два раёны, межы якіх адпавядалі ранейшым упраўленням, пад назвамі «ваеннае ўпраўленне Літва, раён Поўнач» з цэнтрам у Вільні (Litauen, Bezirk Nord) і «ваеннае ўпраўленне Літва, раён Поўдзень» з цэнтрам у Беластоку (Litauen, Bezirk Süd) // Befehl betreffend die Zusammenlegung der Militärverwaltung Litauen und Bialystok-Grodno. 27.01.1918. // Befehls- und Verordnungsblatt des Oberbefehlshabers Ost. – 1918. – № 98. – Z. 695.

224 з цэнтрам у Белавежы (*Etappen-Kommandantur 224 Bialowies*). Межы павета і камендатуры супадалі. Павет, як і камендатуру, узначаліў шэф ваеннага ляснога ўпраўлення Белавежа маёр д-р Эшэрых (*Escherich*) [6]. 31 жніўня 1918 г. ён быў вызвалены з пасады каменданта [14].

Паводле справаздачы шэфа адміністрацыі ваеннага ўпраўлення Беласток-Гродна ротмістра Т. фон Хэпе, у ваенным лясным упраўленні Белавежа на 1 красавіка 1917 г. дзейнічалі 7 лесапільняў з 22 станкамі і 15 цыркулярнымі піламі, шпалапрапітачны завод, фабрыкі па вытворчасці стружкі і драўлянага абутку, сталярня з аўтаматычнымі станкамі і некалькі невялікіх майстэрняў [5, s. 72].

1 верасня 1918 г. кіраўніцтва ваенным лясным упраўленнем Белавежа перайшло да шэфа адміністрацыі пры ваенным губернатары Літвы[2]

---

[2] Згодна з распараджэннем начальніка Генеральнага штаба Германіі П. фон Гінденбурга «Аб утварэнні ваеннага ўпраўлення Балтыйскіх краін і ваеннага губернатарства Літва» ад 24 ліпеня 1918 г. ваеннае ўпраўленне Літва разам з ваенным паветам Сувалкі (Militärkreisverwaltung Suwalki) і ваеннымі ляснымі ўпраўленнямі Белавежа, Беласток, Гродна з 1 жніўня 1918 г. ўтварала ваеннае губернатарства Літва (Militärgouvernement von Litauen) з цэнтрам у Вільні. Замест пасады «шэф ваеннага ўпраўлення Літва» (Chef der Militärverwaltung Litauen) была ўведзена пасада «ваенны губернатар Літвы» (Militärgouverneur von Litauen). Згодна з выканаўчай інструкцыяй да распараджэння ад 24 ліпеня 1918 г. цэнтральная адміністрацыя пры Галоўнакамандуючым на Усходзе – Галоўнае ўпраўленне Обер Ост – ліквідавалася. Пры штабе заставаліся толькі неабходныя рэферэнты для вырашэння адміністрацыйных і эканамічных пытанняў. Сама зона Галоўнакамандуючага на Усходзе была падзелена на ваеннае ўпраўленне Балтыйскіх краін (Militärverwaltung der baltischen Lande) і ваеннае губернатарства Літва (Militärgouvernement Litauen). Ваеннае губернатарства Літва з цэнтрам у Вільні ў тэрытарыяльна-адміністрацыйным плане стала падраздзяляцца на 4 раёны (Bezirkverwaltung) на чале з кіраўнікамі раёнаў (Landeshauptmann): Літва, раён Коўна (Militärverwaltung Litauen, Bezirk Kowno, таксама выкарыстоўвалася раўназначная назва Militärbezirkverwaltung Kowno); Літва, раён Вільні (Militärverwaltung Litauen, Bezirk Wilna); Літва, раён Поўдзень (Militärverwaltung Litauen, Bezirk Süd) з цэнтрам у Беластоку. Пост ваеннага губернатара Літвы 1 жніўня 1918 г. заняў генерал-лейтэнант фон Харбоу (von Harbou), пры якім была ўтворана цэнтральная адміністрацыя // BArch–MA. F. PH 18. Chef der Heeresarchive. Sign. 2366. Aktenverzeichnis des Militärgouvernements Litauen. 1916–1919. Anlage II. Verfügung des Chefs des Generalstabes des Feldheeres. Gen. Qu. II Nr. 2432. 24. Juli 1918; Anlage IV. Dienstanweisung für den Militärgouverneur für Litauen. 24.07.1918; Verordnung betreffend Abänderung der Verwaltungsordnung vom 7.6.1916 (Befehls- und Verordnungsblatt Ziffern 259) und Gliederung der militärischen Landesverwaltung im Befehlsbereich Ost. 27.08.1918. // Befehls- und Verordnungsblatt des Oberbefehlshabers Ost. – 1918. – № 114. – Z. 783.

(*Verwaltungschef beim Militärgouverneur für Litauen*) капітану Ціслеру (*Tiesler*) паводле распараджэння Галоўнакамандуючага на Усходзе генерал-фельдмаршала прынца Леапольда Баварскага ад 27 жніўня 1918 г. «Аб зменах распараджэння ад 7 чэрвеня 1916 г. і арганізацыі ваенных упраўленняў ў зоне Галоўнакамандуючага на Усходзе» [15].

Аб даце і месцы ліквідацыі ваеннага ляснога ўпраўлення Белавежа даных не выяўлена.

## Спіс выкарастаных крыніц

1. Staatsbibliothek zu Berlin Preußischer Kulturbesitz (Дзяржаўная бібліятэка прускай культурнай спадчыны, далей – SBB). – Sign. Krieg1914/29995. Tätigkeitbericht der Etappen-Inspektion XII. Oktober–Dezember 1916. – Bialystok: Druckerei der Militärverwaltung Bialystok–Grodno, 1916. – 19 S.

2. Häpke, R. Die deutsche Verwaltung in Litauen 1915 bis 1918 / R. Häpke. – Berlin: Reichsdruckerei, 1921. – 225 S.

3. SBB. – Sign. Krieg1914/10575–1. Rangliste der Verwaltung des Oberbefehlshabers Ost / bearb. von Abt. V der Verwaltung Ob. Ost. Mitte Juni 1916. – 1916. – 56 S.

4. Neue Bezeichnung von Dienststellen. 04.03.1917. // Befehls- und Verordnungsblatt des Oberbefehlshabers Ost. – 1917. – № 71. – Z.517.

5. Geheimes Staatsarchiv Preußischer Kulturbesitz (Таемны дзяржаўны архіў прускай культурнай спадчыны, далей – GStA PK). – F. HA I. Rep. 89. Sign. 32466. Verwaltungsbericht der Militärverwaltung Bialystok-Grodno für die Zeit vom 1. Oktober 1916 bis 1. April 1917. Bialystok: Druckerei der Militärverwaltung Bialystok-Grodno, 1917. – 78 S.

6. Bundesarchiv-Militärarchiv in Freiburg im Bresgau (Федэральны ваенны архіў у Фрайбургу, далей – BArch–MA). – F. PH 18. Chef der Heeresarchive. Sign. 2114. Aktenverzeichnis des Verwaltungschefs des Militärgouvernements Litauen (Bezirkverwaltung Litauen-Süd, deutscher Generalbevollmächtigter für Litauen und Abwicklungsstelle Berlin-Charlottenburg). Bd. 4. 1915–1919. S. 1137. Geschichte der Militärforstverwaltung Bialowies. O.D.

7. Zusammenlegung der Verwaltungen Grodno und Bialystok. 11.10.1916. // Befehls- und Verordnungsblatt des Oberbefehlshabers Ost. – 1916. – № 53. – Z.405.

8. Ausführungsanweisung zu der Verordnung betreffend den räumlichen Geltungsbereich der im Befehls- und Verordnungsblatt bisher erschienen und der von jetzt ab erscheinenden Befehle und Verordnungen des Oberbefehlshabers Ost vom 27. September 1916. 04.03.1917. // Befehls- und Verordnungsblatt des Oberbefehlshabers Ost. – 1917. – № 71. – Z. 518.

9. Ein Besuch ein Wisentwald Bialowies // Die Woche. – 1916. – H. 2. – 8. Januar. – S. 39.

10. Neue Bezeichnung von Dienststellen. 04.03.1917. // Befehls- und Verordnungsblatt des Oberbefehlshabers Ost. – 1917. – № 71. – Z. 517.

11. SBB. – Sign. 4" Krieg 1914/25168[2a]. Gliederung und Namensliste der militärischen Landesverwaltung des Oberbefehlshabers Ost. Juli 1917. – 70 s.

12. Betr. Etappen-und Verwaltungsgrenzen. Bezug: Ober Ost I c. Nr. 2727/18 geh. vom 26. März 1918. 05.06.1918. // Befehls- und Verordnungsblatt des Oberbefehlshabers Ost. – 1918. – № 107. – Z. 744.

13. GStA PK. – F. I.HA. Rep. 84 A. Sign. 6213. Verwaltungsbericht der Militärverwaltung Litauen, Bezirk Süd in Bialystok für die Zeit vom 1 April bis 30. September 1918. – Bialystok: Bialystoker Zeitung, 1918. – 46 s.

14. BArch–MA. F. PH 30 III. Kaiserliche Militärverwaltungen und Militärmissionen. Sign. 13. Kurzer historischer Überblick über das Generalgouvernement Litauen. S.51–52. Militärforstverwaltung Bialowies.

15. Verordnung betreffend Abänderung der Verwaltungsordnung vom 7.6.1916 (Befehls- und Verordnungsblatt Ziffern 259) und Gliederung der militärischen Landesverwaltung im Befehlsbereich Ost. 27.08.1918 // Befehls- und Verordnungsblatt des Oberbefehlshabers Ost. – 1918. – № 114. – Z.783.

**(Дата поступления: 03.11.2019).**

*Жихарев С. Б.*
Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины, Гомель

*Zhiharev S.*
Francisk Skorina Gomel State University, Gomel

**УДК 94:656.2:625.1(474.6)**

# АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО ЛИТОВСКОЙ ЖЕЛЕЗНОЙ ДОРОГИ: ЭКОНОМИЧЕСКИЕ, ПРАВОВЫЕ, ФИНАНСОВЫЕ И ТЕХНИЧЕСКИЕ ХАРАКТЕРИСТИКИ

# THE LITHUANIAN RAILROAD JOINT-STOCK COMPANY: ECONOMIC, JURIDICAL, FINANCIAL AND TECHNICAL CHARACTERISTICS

*В начале 60-х гг. XIX в. усилилось внимание частных лиц и предпринимателей к строительству железной дороги Белосток – Пинск, что вызвало попытку создания Акционерного общества (далее – АО) Литовской железной дороги. В то же время отказ государства в обеспечении минимальной гарантированной прибыли на ценные бумаги Литовской железной дороги означал проблематичность учреждения АО. Участники проекта должны были инвестировать в ее постройку собственные средства и принять на себя все риски, связанные с ее будущей*